ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

# ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● ● NO. 18 (3522) ● ● ЧАЦВЕР, 18 МАЯ, 2017

ШТОТЫДНЁВІК “ГОЛАС РАДЗІМЫ” МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ: WWW.GOLAS.BY




**Памяць сэрцаў**

У акцыі, што прайшла да Дня Перамогі ў Рыме, паўдзельнічалі супляменнікі з Беларусі Стар. 2



**“Вясёлка” збірае сяброў**

Вядомы і папулярны ў Беларусі дзіцячы часопіс святкуе 60-я ўгодкі Стар. 4



**Куточак роднай зямлі**

У традыцыйнай штогадовай добраахвотнай акцыі “Тыдзень лесу-2017” паўдзельнічалі прадстаўнікі розных этнааб’яднанняў Беларусі Стар. 4

ПАДЗЕЯ

## Землякі ў люстэрку СМІ

### На XXI Міжнароднай спецыялізаванай выставе “СМІ ў Беларусі” ў чарговы раз былі прадстаўлены выданні беларусаў замежжа

Іван Іванаў

Сонцам, доўгачаканай цеплынёй ды бадзёрымі гукамі духавога аркестра сустракае гасцей знакаміты будынак- “рамонак”: Нацыянальны выставачны цэнтр “БЕЛЭКСПА”, што па мінскім праспекце Пераможцаў, 14. Свята! І прыемна, што як актывістам этнасуполак Беларусі, так і беларусам з замежжа ў падобным віры штогод ёсць дзе запыніцца, знайсці “сваё месца” ў людской плыні. Для супрацоўнікаў “ГР” — таксама традыцыя: сустракацца з супляменнікамі на адкрыцці выставы “СМІ ў Беларусі”, пры стэндзе Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў.

Рухаемся “да нашых”, па ходзе віншуем калег са святам. І вось ужо трапляем у моцныя абдымкі Віктара Байкачова, за ім і Людміла Аннус далучаецца да размовы — гэта сябры з эстонскай Нарвы, актыўныя пазаштатныя аўтары “Голасу Радзімы”. А вось і суайчыннікі з Латвіі: Барыс і Валянціна Піскуновы, іхняя дачка Алёна Лазарава, Іна Олесава… Іх, актывістаў Саюза беларусаў Латвіі, пэўна ж, таксама ведаюць нашы чытачы. Газета СБЛ “Прамень”, як заўсёды, прадстаўлена салідна, а побач — і “Уздым”. Гэта маладое выданне. З ім і прыехала на Бацькаўшчыну радасная Людміла Сінякова, кіраўніца суполкі “Уздым” з Даўгаўпілса. З яе рук і атрымліваем каштоўны сувенір: адзін з нумароў газеты. А ў хуткім часе падыходзяць і Ніна Пээрна ды Кэтлін Пукк — беларускі з Таліна.



ЮРЫ МАЗАЛЕЎСКІ

Гасцей і ўдзельнікаў выставы “СМІ ў Беларусі” віталі песнямі артысты

Па словах начальніка аддзела па справах нацыянальнасцяў апарата Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандра Сасновіча, на выставачным стэндзе прадставілі друкаваныя СМІ як суполкі беларусаў за мяжой (ужо згаданыя “Прамень” ды “Уздым”, беларускія спецвыпускі з расійскай газеты “Тюменская область сегодня”) так і нацыянальна-культурныя грамадскія аб’яднанні ў Беларусі. Апошніх — больш: на стэндзе бачым газеты “Авив” Саюза беларускіх яўрэйскіх грамадскіх аб’яднанняў і абшчын ды “Український Вісник” Беларускага грамадскага аб’яднання украінцаў “Ватра”. Наведнікі з цікавасцю гарталі таксама інфабюлетэні суполак беларускіх карэйцаў, немцаў, грузін, казахаў. Дарэчы, друкаваныя выданні нацыянальна-культурных аб’яднанняў Беларусі, удакладняе Аляксандр Львовіч, цалкам прафінансаваны за кошт сродкаў, што выдзелены на гэтыя мэты Упаўнаважанаму з рэспубліканскага бюджэту.

Асноўнаю тэмай выставы “СМІ ў Беларусі” была інфармацыйная бяспека ў сучасным свеце. Яе ўдзельнікам, гасцям і арганізатарам накіраваў віншаванне Прэзідэнт Беларусі. Было прадстаўлена больш за сто розных СМІ, у тым ліку і з замежжа: Балгарыі, Грузіі, Расіі, Германіі, Турцыі, Літвы, Індыі. А ганаровым госцем сёлета быў Кітай, прычым для журналістаў з гэтай краіны ладзіўся і вялікі прэс-тур па Беларусі, пасля якога яны сустракаліся, гутарылі з Прэзідэнтам. → Стар. 4

ВЕСТКІ

## На добры ўспамін

**Скульптурная кампазіцыя “Беларусам свету” з’явіцца да 950-годдзя Мінска каля Траецкага прадмесця**

Памятны знак будзе ўяўляць з сябе кола — адзін з самых старажытных славянскіх сімвалаў, якія ўвасабляюць Сонца, зямны лад жыцця, Вечнасць. Кола выкарыстоўвалася беларусамі ў розных абрадах, святах: на Купалле, на Калядых... У той жа час гэта быў самы неабходны інвентар у сялянскай гаспадарцы. Бронзовую скульптуру дыяметрам прыкладна 3 метры ўсталююць на гранітным валуне з надпісам “Беларусам свету”. Вобраз дапоўніць і стужка з нацыянальным арнаментам.

Пра адметнасці кампазіцыі расказаў адзін з яе аўтараў — доктар архітэктуры, прафесар Армэн Сардараў: “Памятны знак прысвячаецца ўсім беларусам, якія жывуць у розных кутках планеты. Аб’ядноўвае ж усіх гэтых людзей любоў да Радзімы, мовы, звычаяў, культуры. У розных краінах яны ствараюць суполкі, у якіх гучыць роднае слова, радуюць душу і сэрца песні на матчынай мове. На розных кантынентах, нават стаўшы часткай гісторыі іншых краін, яны назаўжды застаюцца беларусамі”.

Па словах скульптара Аляксандра Фінскага, ідэя вывы ўзнікла даўно. Задуму падтрымаў Беларускі фонд культуры. Пасля да справы далучылася і прадпрыемства “Менская спадчына”. У верасні, да 950-гадовага юбілею Мінска, скульптура пабачыць свет. Размесціцца яна ў гістарычным цэнтры горада, каля Траецкага прадмесця, на ўзбярэжжы ракі Свіслач.

Да Дня горада прымеркаваны і сёлетні ўжо трэці Фэст мастацтваў беларусаў свету. Так што беларуская сталіца рыхтуе выдатны падарунак супляменнікам.

ПЕРСПЕКТЫВЫ

## Здароўе... з прабіркі

Іна Ганчаровіч

**Нататкі пра тое, у якіх кірунках развіваецца беларуская фармацэўтычная прамысловасць і медыцынская навука**

Медыцына ў свеце развіваецца такімі хуткімі тэмпамі, што часам здаецца: яшчэ трохі — і ўжо чалавека будуць “абнаўляць” па частках, нібыта машыну ў аўтасэрвісе. Спецыялісты сцвярджаюць, што гадоў праз 10-20 урачы змогуць паспяхова спраўляцца з некаторымі невылечнымі пакуль хваробамі. Нядаўна ў Мінску з удзелам прадстаўнікоў Міністэрства аховы здароўя, фармацэўтычнай прамысловасці ды вучоных прайшла прэс-канферэнцыя, прысвечаная развіццю фармацэўтычнай навукі, найноўшым распрацоўкам у сферы аховы здароўя.

Прагназаваць будучыню аховы здароўя ў свеце не будзем. Раскажам пра новыя лекавыя прэпараты і медтэхналогіі, якія апрабаваны і ў бліжэйшы час будуць укаранёны ў лячэбную практыку Беларусі.

**Лекавыя прэпараты-2017**

Самыя пашыраныя захворванні XXI стагоддзя, якія ўсур’ёз пагражаюць здароўю чалавека, у Беларусі, як і па ўсім свеце, гэта анкалогія, розныя інфекцыі (ВІЧ, гепатыт), цукровы дыябет і сардэчна-сасудзістыя захворванні. Чым заняты беларускія фармацэўты? Пра тое расказала прадстаўніца Дэпартамента фармацэўтычнай прамысловасці Міністэрства Татьяна Тумеля: “Асноўныя напрамкамі нашы на бліжэйшыя пяць гадоў: стварэнне імпартазамяшчальных прэпаратаў, якія па якасных паказчыках не саступаюць арыгінальным і такія ж эфектыўныя і бяспечныя, але пры тым больш даступныя па цэнах”.



У 2017-м з’явіцца новы лекавы прэпарат беларускай вытворчасці для лячэння хворых гепатытам С. У параўнанні з тымі, што ёсць, будзе мець шэраг пераваг: больш эфектыўны, добра пераносіцца. Таму яго можна будзе прымаць і хворым з спадарожнымі захворваннямі. Зручная для ўжывання форма, і кошт — у 10 разоў меншы, чым у імпартных аналагаў.

Яшчэ навінка: прадпрыемства “Белмедпрэпараты” сумесна з кампаніяй NovoNordisk стварае масавую вытворчасць інсуліну ў картрыджах. Прымяняць — значна зручней, чым з флакона. Хворыя на цукровы дыябет змогуць скарыстацца сродкам у любым месцы, бо навінка лёгка змяшчаецца ў кішэні. → Стар. 2



**Беларусы ў Рыме на святкаванні Дня Перамогі**

# Памяць сэрцаў

## У акцыі, што прайшла да Дня Перамогі ў Рыме, паўдзельнічалі супляменнікі з Беларусі

Рым стаў першым горадам на Апенінах, у якім ужо ў другі раз прайшла акцыя "Бессмертный полк". Яе ладзілі Міжнародны культурны цэнтр "Содружество" і Вучэбна-метадычны цэнтр "Николай Гоголь". Дзеці і дарослыя пранеслі па вуліцах фатаграфіі родных — удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Пасля адбыўся канцэрт памяці.

У святочных мерапрыемствах паўдзельнічалі прадстаўнікі Амбасадаў Арменіі, Беларусі, Расіі, Узбекістана, а таксама навучэнцы і настаўнікі нацыянальных школ, актывісты культурных цэнтраў і асацыяцый.

Консул Беларусі Вікторыя Пархоцік расказвала, наколькі памятнае для ўсіх беларусаў свята 9 Мая, якім коштам дасталася краіне Перамога. Гаварыла і пра тое, як важна сёння захоўваць мір, а дзяцей — вучыць памятаць і з павагай ставіцца да гісторыі. Прысутныя ўспомнілі пра гераізм і мужнасць абаронцаў Брэсцкай крэпасці. Вяла праграму намесніца старшыні Міжнароднага культурнага цэнтра "Содружество", член Кансультатыўнага савета па справах беларусаў замежжа пры Міністэрстве замежных спраў Беларусі Ніна Пашчанка. Усяго ва ўрачыстых мерапрыемствах прынялі ўдзел каля 300 прадстаўнікоў краін постсавецкай прасторы, сярод іх і нашы супляменнікі з Мінска, Пінска, Магілёва, Оршы, Барысава.

Сапраўды, для ўсіх нас Дзень Перамогі — гэта не проста каляндарнае свята, але адно з самых шчырых. Пэўна, таму яго дагэтуль і адзначаюць "з слязамі на вачах" і адкрытымі сэрцамі... Прычым святкуюць яго ва ўсіх краінах, пацярпелых ад фашызму. Годна, чулліва, пранікнёна адзначылі й мы 9 Мая ў Італіі. Гэтае свята важнае для кожнай сям'і, кожнага чалавека. Гэта — наш агульны боль, памяць і гонар.

А на наступны дзень прайшло святочнае шэсце на Пьяцца-дэль-Попала (італ. Piazza del Popolo: "Народная плошча" — **Рэд.**), дзе сярод іншых лунаў і беларускі сцяг, як сімвал памяці ды ўдзячнасці ветэранам за Вялікую Перамогу.

**Ніна Пашчанка,**
намесніца старшыні МКЦ "Содружество", г. Рым, Італія

**КАРЫСНЫ ДОСВЕД**

# Маёўка ў Тальяцці

**Беларусы ў паволжскім горадзе выступалі на сцэне гарадскога музейнага комплексу "Наследие" і пасадзілі там дрэўцы**

Шукаць новыя формы працы, знаходзіць новыя пляцоўкі для выступленняў — гэта, можна сказаць, стыль працы нашай беларускай суполкі "Нёман". Аднадумцаў мы знайшлі і ў Музейным комплексе "Наследие", які ўжо другі раз праводзіць разам з намі "Маёўку на Савецкай, 39". Гэта свята вясны і працы, прымеркаванае да чарговай гадавіны пераносу на новае месца з тэрыторыі затаплення (на Волзе стваралася вадасховішча, будавалася вялікая ГЭС) першага стаўрапальскага дома — "Дома Старыкава". З яго, уласна, і пачынаўся новы горад Тальяцці. Надвор'е на гэты раз было сонечнае, і ўтульны дворык пры доме цалкам запоўніўся гасцямі.

Як звычайна, прыйшлі на маёўку прадстаўнікі таварыства стаўрапальчан, на чале з Нінай Саўкінай. Яна пажадала ўсім: жыць у радасці, нягледзячы на тое, што у жыцці бываюць нечаканыя сюрпрызы. Шмат прыйшло дзяцей і моладзі: на канцэрт. Акрамя нашага гурта "Купалінка", паўдзельнічалі ў ім і юныя чытальнікі Дар'я Кужаль і Сямён Карабанаў, студыя сучаснага эстраднага танца "Экспромт" — усе з Палаца творчасці дзяцей і моладзі Цэнтральнага раёна.

Маладыя прыгожыя твары, маляўнічыя строі, чароўныя напевы нашага — народнага! — ансамбля беларускай песні "Купалінка" сталі ўпрыгажэннем канцэрта. Для нашых спевакоў гэта быў незабыўны дзень. Усе хацелі пасадзіць сваё дрэўца — на памяць, таму рыдлёўкі аж рвалі з рук адзін у аднаго. Жарты, смех... Юнакам і дзяўчатам надоўга запомніцца гэты дзень. Потым госці свята яшчэ высаджвалі дрэвы ў двары і побач з домам Старыкава. І старэйшыя спявалі пад акардэон любімыя песні сваёй маладосці. А пераможцы гістарычнай вiктарыны пабывалі на бясплатнай экскурсіі па экспазіцыі "Стары ... новы горад: гісторыя аднаго дома".


**Артысты "Купалінкі" на маёўцы**

Госці маёўкі яшчэ доўга не разыходзіліся, была сяброўская бяседа ў чайнай альтанцы. Хораша і нам быць ва ўсім гэтым. Мяркуем, падобныя маёўкі будуць мець працяг.

**Людміла Дзёміна,** г. Тальяцці

**ПЕРСПЕКТЫВЫ**

# Здароўе... з прабіркі

**(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)**


ТАЦЦЯНА СТАЛЯРОВА
**Сучасная фармацэўтычная вытворчасць у Беларусі**

### Новыя распрацоўкі

Галоўны прынцып беларускай аховы здароўя: сучасныя лекі павінны быць як эфектыўныя, так і даступныя па цане. Спецыялісты скіраваны ў першую чаргу на распрацоўку больш танных тэхналогій. На падыходзе ўжо новыя высокаэфектыўныя прэпараты, каб лячыць рак печані ды нырак. "Вялікія пухліны на гэтых органах вельмі цяжка паддаюцца лячэнню, — распавяла Алена Калінічэнка, намесніца дырэктара па навуковай ды інавацыйнай працы Інстытута біяарганічнай хіміі НАН Беларусі, член-карэспандэнт НАН, доктар хімічных навук. — Цяпер у Беларусі, па свеце дастаткова добра навучыліся лячыць лейкоз — рак крыві. Падбіраюцца камбінацыі рэчываў, якія дазваляюць рэзка павялічыць працягласць і якасць жыцця, здараецца і поўнае вылечванне. Вялікія пухліны і для лячэння вельмі цяжкія, і хірургічнае ўмяшанне дае вынік не заўсёды. Таму мы ўзяліся за распрацоўку новага прэпарата". Ён спыняе рост пухліны. І калі адна таблетка замежнага аналагу каштуе 60 даляраў, то беларускія фармацэўты маюць намер дамагчыся зніжэння кошту свайго прэпарата як мінімум у два разы. І эфектыўнасць у яго — яшчэ вышэйшая.

Эфектыўнасць, бяспека, ніжэйшыя кошты — асноўныя арыенціры. Плюс зручнасць ужывання лекаў. Цяпер "Белмедпрэпараты" распачалі распрацоўку трансдэрмальных тэрапеўтычных сістэм — мяккіх лекавых формаў для вонкавага ўжывання ў форме пластыраў ці плёнак. Такі пластыр будзе наклейвацца на скуру, і лекі праз верхнія яе пласты зусім бязбольна хутка пранікнуць у кроў.

### Новыя тэхналогіі-2017

Сярод інавацыйных распрацовак сёння не толькі новыя лякарствы і тэхналогіі вытворчасці, але і тэхналогіі лячэння. Найперш гаворка — пра тэхналогіі клеткавыя, заснаваныя на выкарыстанні ствалавых клетках. Так, у Інстытуце фізіялогіі НАН Беларусі распрацавана ўнікальная тэхналогія лячэння хворых з траўмамі галаўнога мозгу і пацыентаў з інсультамі. "Па гэты час ва ўсім свеце ствалавыя клеткі ўводзіліся пацыентам ці ўнутрывенна, ці праз сонную артэрыю, ці праз трэпанацыйную адтуліну ў чэрапе, — пасвячае ў тонкасці справы намеснік дырэктара па навуковай рабоце Інстытута фізіялогіі НАН Беларусі, член-карэспандэнт, доктар медыцынскіх навук, прафесар Уладзімір Кульчыцкі. — Рабіць тое досыць складана, тым больш для чалавека ў цяжкім стане. Мы вырашылі выкарыстоўваць здольнасць ствалавых клетак перамяшчацца уздоўж валокнаў чэрапна-мазгавых нерваў. І ў вобласці заканчэння нерва, напрыклад носа, мы ўводзім невялікі аб'ём (0,1 мл) раствора, у якім ёсць ствалавыя клеткі, яны ўжо праз гадзіну пачынаюць назапашвацца ў месцы траўмы. З дазволу Мінздрава 20 пацыентам з захворваннямі мозгу з іх згоды ўжо сёлета сумесна з нейрахірургамі РНПЦ акрамя лекавай тэрапіі, якая пакуль, на жаль, не вельмі эфектыўная, будзе выкарыстоўвацца і такая тэрапія.

Яшчэ ў Інстытуце фізіялогіі даследуюць уласцівасці чалавечага бялку лактаферыну, атрыманага з малака трансгенных коз, вырашчаных супрацоўнікамі НПЦ НАН Беларусі. Навукоўцы распрацоўваюць методыкі, каб прымяніць яго для павышэння проціпухліннай актыўнасці імуннай сістэмы. Прыкладная значнасць падобных распрацовак у сферы анкалогіі — велізарная. Знайшлі вучоныя і спосаб, каб перамагчы хранічны недасып. Спецыялісты РНПЦ атарыналарынгалогіі сумесна з навукоўцамі з Інстытута фізіялогіі распрацавалі тэхналогію і прыладу для пацыентаў, у якіх часта здараюцца выпадкі прыпынку дыхання пад час сну. Бывае, іхні храп перапыняе начны сон у начны кашмар, а частыя прыпынкі дыхання ў сне могуць прывесці да інсульту, інфаркту, нават раптоўнай смерці. Цяпер ёсць сродак, каб спаць спакойна.

І на заканчэнне. Заслугоўваюць павагі намаганні нашых лекараў, фармацэўтаў і навукоўцаў. А ўсё ж і яны пагодзяцца: лепш весці нам здаровы лад жыцця, чым разлічваць на таблеткі, новыя тэхналогіі... Паводле навуковых даследаванняў, на 50% здароўе чалавека залежыць якраз ад ладу жыцця, 15-20% прыпадае на спадчыннасць, на 20-25% на чалавека ўплывае навакольнае асяроддзе. І толькі працэнтаў на 10-15 залежыць наша здароўе ад медзабеспячэння, сярод якога медыкаментознае лячэнне займае невялікую долю.

**МОВАЮ ЛІЧБАЎ**

**По стане на 1 сакавіка 2017 года ў Беларусі зарэгістравана 4,5 тыс. лекавых сродкаў, у тым ліку 1,6 тыс. айчыннай вытворчасці. Летась на фармацэўтычны рынак паступіла 116 новых айчынных лякарстваў. Больш за 25% выробленых лекавых беларускіх прэпаратаў ідзе на экспарт: у 29 краін.**

РОДНАЕ

# “Вясёлка” збірае сяброў

## Вядомы і папулярны ў Беларусі дзіцячы часопіс святкуе 60-я ўгодкі

**Іван Ждановіч**



ІВАН ЖДАНОВІЧ

Юныя артысты віншавалі сваю любімую “Вясёлку” песнямі, танцамі, вершамі

Усё лепшае — дзецям... Гэтыя словы ўвасобіліся прыгожаю явай, калі ў 1957-м таленавітыя людзі з ліку пісьменнікаў, мастакоў пачалі рабіць часопіс для беларускіх дзяцей. Узначаліў тады — на 17 гадоў — новую рэдакцыю Васіль Вітка: вясковец са Случчыны, педагог па адукацыі, паэт-казачнік і тонкі знаўца дзіцячых душаў. Гэта ён, дарэчы, прыдумаў і Васю Вясёлкіна… Помніцца, гутарылі мы з Цімохам Васільевічам (сапраўднае імя пісьменніка) неяк у 91-м, перад ягоным 80-годдзем, і на пытанне, як гэта з гадамі не развучыцца радавацца жыццю, захапляцца прыгажосцю свету, ён параіў: “Часцей глядзіце на зоры”. З такім загалоўкам і выйшла тое інтэрв’ю ў часопісе для настаўнікаў “Роднае слова”. Дарэчы, у Васіля Віткі, пазней даведаўся, ёсць і цікавае эсэ пад такою ж назвай: пра тое, як прачынаецца ў ягонай чуллівай душы казачнік, паэт. Прывучае сёння “Вясёлка” юных чытачоў і “на зоры глядзець”, і “пад ногі”, і ў мастацтве разбірацца, і слова роднае, традыцыі беларусаў паважаць. А яшчэ — выцінанкі рабіць, маляваць, вершаваць… Нават абыходзіцца з грашыма разумна прывучае дзетак “Вясёлка” ў “Школе Грошыка”: гэта яе сумесны творчы праект з Беларусбанкам “па асвеце юных фінансістаў і банкіраў”.

Мудрага пачынальніка-дзеда Васіля Вітку, ягоных калег-паслядоўнікаў Еўдакію Лось, Анатоля Грачанікава добрым словам згадвалі й на юбілейнай урачыстасці, з густам упрыгожанай святочным канцэртам, у мінскім Палацы культуры прафсаюзаў. Казалі й пра тое, што ў ліку аўтараў “Вясёлкі” былі, ды й сёння ёсць многія таленавітыя празаікі, паэты, мастакі. Аддавалі належнае Уладзіміру Ліпскаму як пісьменніку, арганізатару: гэта ён з 1978 года “ўзначальвае выданне ды гуртуе вакол яго лепшыя творчыя сілы Беларусі”. Доўгажыхар на “вясёлкаўскай” пасадзе, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі й сам 6 мая, на Юр’я па народным календары, адзначыў 77-годдзе. Але ж колькі ў гэтым сівавалосым аптымісце светлай энергіі! Ён да таго ж і такія крэатыўныя па форме і змесце кнігі свае, бадай, штогод выдае. І Беларускі дзіцячы фонд ад часу ягонага стварэння (1988) узначальвае, і ў Фестывалю гумару ў Аўцюках ён — як бацька хросны… Адным словам: Асоба. У серыі пад такой назвай, дарэчы, і выйшла нядаўна кніжка пра Уладзіміра Сцяпанавіча. А да юбілею “Вясёлкі” грунтоўнае інтэрв’ю з галоўрэдам, пісьменнікам падало інфармацыйнае агенцтва БелТА: яго лёгка знайсці па ключавых словах “Липский юбилей Вясёлка”.

Весялосць і гумар у “Вясёлцы” з такім гумарным галоўрэдам — вельмі любяць. Сярод шматлікіх віншаванняў, якія паступілі на адрас юбіляркі, ёсць і “Высновы навукоўцаў у Год навукі”. Прыслухаемся. “Якія ў малечы найпершыя словы — Зрабілі вучоныя сёння высновы./ У працы ранейшыя ставяць дапіскі:/ Малеча шчабеча/ Ад самай калыскі/ Не “мама” і “тата” — “Вясёлка” ды “Ліпскі”./ Апошнім жа часам па ўсёй Беларусі/ Яшчэ прамаўляюць лагоднае “Буся”... Гэта, нагадаем, у “Вясёлкі” пяць гадоў таму з’явіўся малодшы брацік — часопіс “Буся” для дашкалят. І наша газета пра тую падзею пісала.




ІВАН ЖДАНОВІЧ

Уладзімір Ліпскі на чале рэдакцыі ўжо амаль 40 гадоў

Вернемся, аднак, на “Свята колераў вясёлкі”. На сцэну, паводле задумы арганізатараў, падымаліся як дарослыя, так і дзеці. Ад Міністра інфармацыі Лiліі Ананіч (яна зачытала віншаванне “Вясёлцы” ад Прэзідэнта, уручала ўзнагароды супрацоўнікам рэдакцыі), да юных артыстаў з мінскага дзіцячага садка “Ліхтарык” (малыя чыталі вершы, спявалі, танцавалі). “Актывізацыю залы праводзяць мімы” — знайшоў я рэмарку ў сцэнарным плане. Бо ў глядзельнай зале сабралася шмат гасцей: ад малодшых школьнікаў да ветэранаў. Сярод іх і вядомыя пісьменнікі, педагогі, журналісты, дзеячы культуры. І ўсе — сябры “Вясёлкі”. Многія прывезлі юбілярцы падарункі, у тым ліку і зробленыя сваімі рукамі, нумары мастацкай самадзейнасці. Песнямі, танцамі, вершамі павіншавалі юбілярку артысты беларускай эстрады, дзіцячыя гурты “Шакаладная фабрыка”, “Святкі”, “Хвілінка” ды іншыя. А ўзнагароды вясёлкаўцам ды сябрам, актыўным аўтарам выдання ўручалі прадстаўнікі Мініінфармацыі, Мінадукацыі, Мінкультуры, Саюза пісьменнікаў Беларусі, Беларускага саюза журналістаў.

Звяртаючыся да сяброў часопіса, Уладзімір Ліпскі казаў, што “Вясёлка” — гэта яго жыццё, і ягоны лёс, і ягоны рай зямны. Што ён удзячны лёсу, і гэтаму раю, удзячны жыццю — за “Вясёлку”, якая нарадзілася вясною 60 гадоў назад. А далей — падключыў усіх да цікавай гульні, запытаўшы: “У вясёлцы — колькі колераў?” Зала, вядома ж, гукала: “Сем!” А Уладзімір Сцяпанавіч налічыў 60 колераў зямной “Вясёлкі”. Пачаў пералічваць: яна добрая, спагадлівая, прыветлівая, казачная, і святочная заўжды, і вясновая, а яшчэ — патрэбная і запатрабаваная... А ўрэшце папрасіў сяброў, што прыйшлі на свята, пашукаць і новыя колеры зямной “Вясёлкі” ды прысылаць на электронны адрас выдання. А той, хто знойдзе больш за 60 “колераў”, мае шанец атрымаць прыгожы падарунак. Прызнаюся: і мяне павяло ў пошукі. Ужо больш за сотню “колераў” “Вясёлкі” знайшоў, ды адчуваю: пералік яе вартасцяў можна доўжыць. Вось на адну толькі літару колькі вызначэнняў знайшлося: далікатная, дасціпная, дасведчаная, даступная, дзіцячая, дзівосная, друкаваная, добразычлівая, дзейная, духоўная, душэўная...

Яшчэ галоўрэд адзначыў: “Вясёлка” трымаецца на сябрах, у тым яе прыгажосць і сіла: “10 тысяч “Вясёлак” паштальёны штомесяц разносяць па ўсёй Беларусі, і 10 тысяч сем’яў беларускіх чытаюць, гартаюць, атрымліваюць асалоду ад “Вясёлкі”. У нас ёсць маленькія сябры, крыху большыя сябры, і яшчэ большыя, а ёсць і дарослыя сябры”. Дарэчы, на ўрачыстасці ўпершыню ўручаліся дыпломы, прысвойвалася ганаровае званне “Сябар дзяцей”: яго заснавала рэдакцыя сумесна з рэспубліканскім грамадскім аб’яднаннем “Сябры Вясёлкі”. А пасведчанне пад №1 атрымала Міністр інфармацыі Лілія Ананіч. Дарэчы, у згаданую суполку сяброў “Вясёлкі” ўваходзяць якраз “старэйшыя сябры” выдання — як асобныя людзі, так і цэлыя калектывы.

Між тым стаць сябрамі папулярнага дзіцячага часопіса ды маладога “Бусі” могуць і актывісты з беларускіх суполак замежжа ды іх дзеці, унукі. Уладзімір Ліпскі ў размове са мной заўважыў: “Мы не проста сядзім у кабінетах ды робім часопіс — мы актыўна рухаемся да дзяцей, праводзім вялікую арганізацыйную работу, маем для гэтага спецыяльны аддзел”. Наша газета расказвала, дарэчы, пра сустрэчы пісьменніка з беларусамі Польшчы. У інтэрв’ю карэспандэнту БелТА Уладзімір Ліпскі нагадаў, што ў часопіса ёсць афіцыйны сайт. Акрамя таго, абмяркоўваецца прапанова па распаўсюдзе “Вясёлкі” ды “Бусі” сіламі аднаго з мабільных аператараў сувязі. Галоўрэд спадзяецца, што “ў перспектыве “Вясёлка” і “Буся” пойдуць і ў замежжа, стануць даступнымі для ўсіх беларусаў свету. На мой погляд, каб дзеці памяталі й любілі родную мову і культуру, пачынаць трэба з гэтых часопісаў”.

Галоўрэд падлічыў, што выступіў летась перад дзецьмі больш за 100 разоў! А ягоная намесніца Анастасія Радзікевіч дадае: творчыя сустрэчы-канцэрты з сябрамі “Вясёлкі” да юбілею выдання праходзяць у школах, дзіцячых садках, бібліятэках Мінска, а таксама ў Барысаве, Дзяржынску, Любані, Навагрудку, Нясвіжы, Салігорску, Слуцку, Оршы. Уладзімір Сцяпанавіч лічыць: пры дапамозе “Вясёлкі” лёгка далучаць супляменнікаў да беларускай мовы, культуры, паэзіі. Дарэчы, настаўніца пачатковых класаў з Мінска Ірына Бутарына распрацавала 50 арыгінальных урокаў: якраз да юбілею кніга «Урокі “Вясёлкі”» выйшла ў выдавецтве “Адукацыя і выхаванне”. Такі падручнік аж “просіцца” на ўрокі, што праходзяць у нядзельных беларускіх школах, беларускіх класах. Сайт, каардынаты рэдакцыі шукайце ў інтэрнэце. І журналісты газеты “ГР” трапілі ў пачэснае кола сяброў “Вясёлкі” — то можна адладзіць кантакты і праз нас.

ПОВЯЗЬ ЧАСОЎ

# Паэзія, што яднае людзей

**Памяць пра знакамітага беларускага паэта Максіма Багдановіча ўшаноўваюць у Яўрэйскім культурным цэнтры расійскага горада Яраслаўля**

З 30 красавіка па 20 мая ў цэнтры праходзіць выстава “Геній зямлі Беларускай”, прысвечаная 100-й гадавіне з часу адыходу ў Вечнасць знакамітага паэта. Ён памёр, як вядома, 25 мая 1917 года ў Ялце. Выстава падрыхтавана паводле матэрыялаў з фондаў мінскага Літаратурнага музея Максіма Багдановіча.

Вітальнае слова на адкрыцці выставы казала Надзея Носава, кіраўніца Яўрэйскага культурнага цэнтра. Пра лёс і творчасць паэта расказала Наталля Прохарава, загадчыца Яраслаўскага мемарыяльнага дома-музея Максіма Багдановіча.

Плённа папрацавалі, рыхтуючы выставу, Цэнтр беларускай культуры і яраслаўская яўрэйская абшчына. Такая супраца — з’ява не выпадковая. Даўным-даўно жывуць яўрэі на беларускай зямлі: яшчэ з часоў Вялікага Княства Літоўскага. У 1388 годзе вялікі князь Вітаўт выдаў прывілей яўрэям на пасяленне ў шэрагу гарадоў княства, і ў тым ліку ў Берасці — цяперашнім Брэсце. І ў тыя часы тысячы яўрэяў атрымалі прытулак ад ганенняў і пагромаў, што бушавалі ў Цэнтральнай Еўропе, а Вялікае Княства — магчымасць інтэнсіўна развіваць гандаль і рамёствы. Госці выставы ўспомнілі знакамітых мастакоў Марка Шагала, Хаіма Суціна ды іншых знакамітых яўрэяў, якіх дала свету Зямля Беларуская. Згадалі яшчэ й класіка беларускай літаратуры Змітрака Бядулю — сябра Максіма Багдановіча, Менавіта ў яго жыў паэт у Мінску, ад яго і паехаў у Ялту — назаўжды.

На адкрыцці выставы асаблівую атмасферу стварылі госці-беларусы, якія чыталі творы класіка на беларускай мове. Мы захапляліся светлымі вобразамі, прыгожай мовай, на якой пісаў Максім Багдановіч. Творы пісьменніка чыталі студэнты Яраслаўскага дзяржуніверсітэта, прыхаджане сінагогі, а таксама іншыя госці. Прычым вершы, выбраныя для чытання, былі самыя розныя. Мы даведаліся, што Максім Багдановіч пісаў вершы грамадзянскія, пейзажныя, філасофскія. Ёсць у яго і шэраг любоўных вершаў, прысвечаных Ганне Какуевай — жыхарцы Яраслаўля, у якую паэт быў закаханы.



Кацярына Міцкевіч

Біяграфія і творчасць Максіма Багдановіча — гэта каштоўны сплаў розных культур, вобразаў розных народаў. Таму пад час адкрыцця выставы гарманічна гучала знакамітая песня “Хава Нагіла” — яе спявала капэла Яраслаўскага дзяржуніверсітэта. А потым песню “Малітва” выканала Кацярына Міцкевіч, супрацоўніца Яраслаўскага мемарыяльнага дома-музея Максіма Багдановіча.

Выставу “Геній зямлі Беларускай” цяпер штодзень наведваюць жыхары і госці горада.

**Кацярына Самусенка,**
г. Яраслаўль



Пра непаўторную прыгажосць беларускіх лясоў вядома далёка за межамі краіны

# Куточак роднай зямлі

## У традыцыйнай штогадовай добраахвотнай акцыі "Тыдзень лесу-2017" паўдзельнічалі прадстаўнікі розных этнааб'яднанняў Беларусі

**Кацярына Мядзведская**

Старшыня Івянецкага аддзела Саюза палякаў на Беларусі Станіслаў Бурачэўскі жартуе: "Жыццё ў мяне склалася: дом свой — сам пабудаваў, дрэва, дый не адно, пасадзіў, дачка падарыла цудоўнага ўнука". Якраз для любімага ўнучка пасадзіў дзядуля каля хаты экзатычнае дрэва катальпу. Крона ў яго раскідзістая, шырокая — будзе добра пясочніцу ад сонца ўкрываць. Шмат у дбайнага гаспадара на ўчастку розных відаў яблынь, груш, сліў, алычы. Ёсць і маліна, і агрэст. Вельмі любіць разводзіць ён ружы...

"Сапраўды цуд: усё расце, квітнее, зелянее, — прызнаецца Станіслаў Іванавіч. — Глядзіш — і душа радуецца". Наводзіць парадак на зямлі, упрыгожваць родны куток, упэўнены ён, — клопат кожнага з нас. Вось і ў рэспубліканскай акцыі "Тыдзень лесу-2017" удзельнічаў Станіслаў Бурачэўскі не ўпершыню. Ужо ў шосты раз кіраўнікі, прадстаўнікі розных нацыянальна-культурных аб'яднанняў Беларусі, пад эгідай апарата Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў, высаджваюць дрэвы ў ваколіцах Івянца.

Начальнік аддзела па справах нацыянальнасцяў апарата Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандр Сасновіч кажа: " Працавалі мы гэтым разам у Ракаўскім лясніцтве Валожынскага лягаса. Былі прадстаўнікі нямецкага, польскага, рускага, татарскага, чувашскага нацыянальна-культурнага аб'яднанняў. Усяго — чалавек 12. І сумеснымі намаганнямі высадзілі каля 5 тысяч саджанцаў елкі".

Кіраўнік Міжнароднага аб'яднання чувашоў "Атал" Генадзь Аляксандраў прызнаецца: "Хоць рукі ад мазалёў некалькі дзён пасля балелі, ды ўсё роўна задаволены: добрую справу зрабілі".

У папярэднія гады дружная інтэрнацыянальная каманда ўжо высаджвала сосны, елкі, бярозы, а летась у мінскім гадавальніку — бэз. "Цікава было б паглядзець на тыя нашыя першыя сасонкі, што высадзілі ў 2012-м ля вёскі Каралеўшчына пад Івянцом, — кажа Станіслаў Бурачэўскі. — Відаць, вялікія ўжо выраслі. Буду праязджаць міма — абавязкова сфатаграфую, здымкі ўсім разашлю". А ў тым, што дрэвы тыя добра прыжыліся, ніхто з удзельнікаў штогадовых добраахвотных акцый не сумняваецца.



Працуе Станіслаў Бурачэўскі

"Працуем заўсёды ў добрым настроі, — кажа Аляксандр Сасновіч. — Дружна, весела! І карысную справу робім, і адзін пра аднаго больш даведваемся. Здзівіла сёлета мяне кіраўніца аб'яднання нямецкай культуры "Масты" Вольга Штокман. Чалавек, зразумела, ужо ва ўзросце... Але колькі ні прапаноўваў ёй сваю дапамогу, адмаўлялася. А працавала на роўных, дый нас яшчэ падганяла".

Дарэчы, сёлетняя акцыя "Тыдзень лесу-2017" — незвычайная: юбілейная, дзясятая па ліку. Прысвячалася яна аднаўленню лясоў, якія былі пашкоджаны стыхійнымі бедствамі. Праводзілася ва ўсіх рэгіёнах Беларусі. Добраахвотнікі высаджвалі дрэвы, закладвалі памятныя алеі, скверы, прыводзілі ў парадак месцы адпачынку ў лесе. У "зялёным" тыдні паўдзельнічалі дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі, прадстаўнікі міністэрстваў энергетыкі, надзвычайных сітуацый, замежных спраў, сельскай гаспадаркі, аховы здароўя, спорту і турызму, памежнага і следчага камітэтаў, Нацбанка і многія іншыя.

Беларуская зямля яшчэ больш папрыгажэла, і вока радуюць маладыя дрэўцы... Паводле дадзеных Мінлясгаса, на плошчы 25,5 тысяч гектараў ідуць у рост новыя лясы. Болей за 5 тысяч гектараў лесу пасаджана сёлета на тых тэрыторыях, па якіх прайшоўся леташні ўраган.

### АД РЭДАКЦЫІ

## Новае месца для сустрэч

**У рэдакцыі газеты "Голас Радзімы" змяніўся паштовы адрас і тэлефоны**

Звычайна ўвесну і летам значна больш супляменнікаў з розных краін прыязджае ў Беларусь, на зямлю продкаў. Некаторыя з іх наведваюць і рэдакцыю газеты "Голас Радзімы", сустракаюцца з нашымі журналістамі. Таму з набліжэннем "сезону сустрэч" інфармуем, што рэдакцыя газеты нядаўна пераехала з праспекта Незалежнасці, 44.

Цяпер мы знаходзімся на паштовым адрасе:

**220013 Мінск, вул. Багдана Хмяльніцкага, 10а. Дом прэсы, 722 пакой.**

Паштовыя адпраўленні, якія прыходзяць на ранейшы адрас рэдакцыі газеты, цяпер па нашай просьбе перасылаюцца на новы адрас. Тэлефоны журналістаў у офісе рэдакцыі: (+375 17) 287 15 26 (Кацярына Мядзведская); (+375 17) 287 15 32 (Іван Ждановіч).

Даводзім да ведама ўсіх, хто плануе з намі сустракацца, што ў дні, калі вядзецца працэс вёрсткі, а таксама вычытваецца карэктуры, ідзе здача свежага нумара газеты ў друк (пятніца і панядзелак), супрацоўнікі газеты працуюць і па адрасе: вул. Кісялёва, 11 (у раёне Плошчы Перамогі).

Паважаныя супляменнікі! Сёлета ў вас будуць розныя нагоды, каб наведаць родную сваю Бацькаўшчыну. Адна з найбольш знакавых — прымеркаваны да 950-гадовага юбілею Мінска чарговы, ужо трэці па ліку Фэст мастацтваў беларусаў свету. Мяркуем, вы ўжо ведаеце пра яго ды ўносіце Фэст у свае планы. Калі ласка, просім вас папярэдне інфармаваць нас пра тое: каб узгадніць нашы дзеянні. Асабліва ж важна тое ў час адпачынкаў, калі кожны тыдзень меншым складам калектыву мы рыхтуем матэрыялы ў чарговы нумар газеты. А найлепш скантактавацца з намі — па электроннай пошце golas_radzimy@tut.by Тады мы зможам выбраць зручны варыянт для сустрэчы.

**Калектыў рэдакцыі газеты "Голас Радзімы"**

# Землякі ў люстэрку СМІ

**(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)**

І для карэспандэнтаў СМІ арганізацый суайчыннікаў з Латвіі, Украіны, Эстоніі, Расіі, што былі запрошаны паўдзельнічаць у працы выставы, прайшоў цікавы семінар-практыкум. Яго ладзілі апарат Упаўнаважанага сумесна з Мінскім аблвыканкамам на базе Мінскага абласнога інстытута развіцця адукацыі. Перад супляменнікамі выступілі выкладчыкі інстытута, былі сустрэчы ў Міністэрстве замежных спраў, Мінскім аблвыканкаме, выезд у Маладзечна. Спадзяемся, удзельнікі яго яшчэ падзеляцца сваімі ўражаннямі.

На сёлетняй выставе адразу два супрацоўнікі рэдакцыі былі ўшанаваны ў ліку пераможцаў Рэспубліканскага конкурсу сярод журналістаў і СМІ на лепшае асвятленне пытанняў міжнацыянальных і міжканфесійных адносін, міжкультурнага дыялогу ў Беларусі ды супрацоўніцтва з суайчыннікамі за мяжой. І мы ў чарговы раз пераканаліся: а прыемна ж прыходзіць на свята, якое ты й сам рыхтаваў! І хоць ні стэнды супрацоўніцтва газеты "Голас Радзімы" не афармлялі, ні асобную прэзентацыю выдання не рабілі, аднак высокія ўзнагароды атрымалі: Іван Ждановіч — дыплом ІІ ступені ў намінацыі "Друкаваныя СМІ ды інфармацыйныя агенцтвы" ад Міністэрства інфармацыі, а Кацярына Мядзведская — дыплом Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў. Дарэчы, два ўшанаваныя журналісты з аднаго выдання — рэдкая з'ява на падобным конкурсе, бо ў асноўным адзначаюцца творчыя калектывы. Так што ёсць чым нам ганарыцца!

Пасля таго, як пабылі ўжо ў Беларусі, прадстаўнікоў замежных суполак беларусаў 5 мая сустракаў Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Леанід Гуляка. Як заўсёды, цёплай, душэўнай была размова. Супляменнікі расказвалі пра свае справы, а Леанід Паўлавіч — пра тое, як у Беларусі адладжана работа з нацыянальна-культурнымі суполкамі, а таксама ў канфесійнай сферы. Давай слушныя парады, выслухоўваў прапановы. Часам і спрачаўся, і тлумачыў, і пераконваў. Амаль двухгадзінная сустрэча прайшла ў пазітыўным ключы. Трохі штучнай, праўда, падалася мне спрэчка пра новую назву беларускай суполкі ў Эстоніі: "Спадкі". Некаторыя настойвалі: мауляў, няма такога слова ў беларускай мове. Мне ж як журналісту няёмка было ўмешвацца ў спрэчку, хоць я з дзяцінства такое слоўца чуў у сваёй роднай вёсцы Яцкаўшчыне, што пад Клецкам. Потым і ў інтэрнэце знайшоў: спадкі — гэта размоўнае слова. Азначае: "Маёмасць, якая пасля смерці ўладальніка пераходзіць у карыстанне каго-небудзь". Карацей, спадкі — гэта нешта канкрэтнае, што застаецца ў спадчыну. І калі ўжо ёсць да суполкі "Спадкі" такі вось інтарэс, то й нам варта будзе пра яе расказаць.



Журналісты "Голасу Радзімы" з беларусамі замежжа

**Заснавальнік:** Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия». Вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, Мінск
**Рэдактар** Віктар Міхайлавіч Харкоў
**Адрас рэдакцыі:** Вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, Мінск
**Рэгістрацыйнае пасведчанне № 61.** Выдадзена 2 сакавіка 2009 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь
**Бюро па рэкламе:** Тэл. +375 17 287 16 91
**Тэлефон рэдакцыі:** +375 17 287 15 32; факс: +375 17 287 15 26
**E—mail:** golas_radzimy@tut.by
**Аб'ём выдання:** 1 друк. арк.
**Тыраж:** 1950, **Заказ:** 650
Газета надрукавана на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/106 ад 30.04.2004. Праспект Незалежнасці, 79, 220013, Мінск
**Час падпісання ў друк:** 20.10
Выходзіць 1 раз на тыдзень

Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках "Голасу Радзімы", могуць не супадаць.
**© "Голас Радзімы", 2017**